# Сінод - голас Касцёла

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
21.11.2021 00:00




У кастрычніку ва ўсіх дыяцэзіях Каталіцкага Касцёла ў свеце пачаўся дыяцэзіяльны этап падрыхтоўкі да Сінода Біскупаў. Усе супольна распазнаюць знакі Божага дзеяння і Яго намеры адносна Касцёла сёння.

Ідэя Сінода не заключаецца ў тым, што плануюцца нейкія змены. Трэба ў гэты час прыслухоўвацца да таго, што сёння Святы Дух кажа Касцёлу – гэта значыць нам, нашым парафіям, супольнасцям, сем,ям і розным ініцыятывам.† Толькі калі мы разам пачуем Божы голас, то зможам пачаць думаць, што рабіць, каб ажывіць яго.

Просьма Святога Духа, які нас вядзе, каб пасяліўся ў нашых сэрцах, паказаў нам, па якой дарозе і як мы павінны ісці!